Опыт и разработки прошлых лет сегодня широко применяются в медицине, спасая ежедневно миллионы жизней [1, 3].

**Литература**

1. Елисеева, Е. С. Промышленное получение тромбина в годы Великой Отечественной войны / Е. С. Елисеева, М. С. Скорова, О. А. Кистенева // Молодежный Инновационный Вестник. – 2019. – Т. 8, прил. 1. – С. 55.

2. Эльяшевич, Е. Г. Открытие антибиотиков в период Великой Отечественной войны / Е. Г. Эльяшевич, Д. А. Василевич, Д. И. Каплич // Военная медицина. – 2012. – № 4. – С. 148-150.

3. Исследовательская работа по теме «Медицинские исследования в годы Великой Отечественной войны и их применение в наше время» [Электронный ресурс]. – Режим доступа https://znanio.ru/media/issledovatelskaya-rabota-po-teme-meditsinskie-issledovaniya-v-gody-vov-i-ih-primenenie-v-nashe-vremya-2754330. – Дата доступа: 29.01.2024.

# ГЕРОІ ПЕРШЫХ ДЗЁН ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ

**Баярчук В. В.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Беларусь.

**Навуковы кіраўнік – Шафарэвіч І. А.**

**Уводзіны.** Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" – гэта гістарычнае месца Рэспублікі Беларусь, якое захоўвае памяць аб вялікім подзвігу савецкага народа. Брэсцкая крэпасць была ўзведзена яшчэ ў 1842 г. на месцы антычнага гарадзішча, на выспах паміж рэкамі Заходні Буг і Мухавец і была ў той час сапраўдным шэдэўрам ваенных інжынераў К. Апермана, Малецкага і А. Фельдмана. Але галоўная асацыяцыя, якая ўзнікае ў сувязі з Брэсцкай крэпасцю – гэта гераічнае і мужнае супраціўленне савецкіх воінаў у 1941 г.

**Мэта.** Адлюстраваць подзвіг людзей, якія першымі адбілі атаку ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі.

**Матэрыялы і метады.** Даследаванне і сістэматызацыя інфармацыі пісьмовых крыніц і інтэрнет-рэсурсаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Штурм крэпасці і захоп горада Брэста быў даручаны 45-й пяхотнай дывізіі генерал-маёра Фрыца Шліпера. Для вядзення артпадрыхтоўкі на працягу першых пяці хвілін дывізіі



Репозиторий ГрГМУ

надаваліся мартырныя дывізіёны 31-й і 34-й пяхотных дывізій 12-га армейскага корпуса 4-й нямецкай арміі. У 4:15, 22 чэрвеня па крэпасці быў адкрыты артылерыйскі агонь. А ў 4:23 пачаўся штурм. Нечаканая атака разбіла гарнізон на некалькі ачагоў. Першая хваля немцаў прайшла да Паўночнай брамы Кобрынскага ўмацавання, не сустрэўшы супраціўлення. Але другая была сустрэта контратакай. У выніку немцы змаглі замацавацца на асобных участках цытадэлі, уключаючы будынак клуба (былая царква Святога Мікалая), сталовую каманднага складу і ўчастак каля Брэсцкай брамы, на Цярэспальскім, на частцы Валынскага і захадзе Кобрынскага ўмацаванняў [1].

У раёне Заходняга форта і дамоў камсаставу на Кобрынскім умацаванні змагалася група пад камандаваннем капітана В. У. Шаблоўскага. 24 чэрвеня коштам вялікіх страт нямецкім захопнікам удалося захапіць у палон апошніх абаронцаў гэтага ўчастка абароны. Сярод іх аказаўся і паранены В. У. Шаблоўскі разам са сваёй сям'ёй. Выбраўшы момант, ён крыкнуў: "Хто не хоча заставацца ў палоне, за мной!" – і кінуўся з маста ў абводны канал, за ім многія байцы, дзе і быў застрэлены. Зімой 1943 г. гітлераўцы павесілі яго жонку, сувязную партызанскага атрада (пасмяротна ўзнагароджана медалём "Партызану Айчыннай вайны"). В. У. Шаблоўскі пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені.

У раёне Цярэспальскай брамы працягвалі змагацца групы лейтэнанта А. Я. Патапава і пагранічнікі лейтэнанта А. М. Кіжаватава. 29 чэрвеня, калі боепрыпасы амаль скончыліся, было прынята рашэнне зрабіць апошнюю адчайную спробу прарыву. Прарывацца меркавалася на поўдзень, у бок Заходняй выспы, каб потым пераплысці рукаў Буга і прабрацца ў наваколлі Брэста. Гэты прарыў скончыўся няўдачай – большасць яго ўдзельнікаў загінула ці была захоплена ў палон. А. Я. Патапаў, які ўзначальваў групу прарыву, загінуў у гэтым баі. Ён быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені. 29 чэрвеня А. М. Кіжаватаў застаўся прыкрываць групу прарыву і загінуў у баі. У 1942 г. пад г. Брэстам немцы захапілі сям'ю чырвонага камандзіра Кіжаватава – маці Анастасію Іванаўну, жонку Кацярыну Іванаўну, дочак Нюру і Галю, а таксама сына Івана. Усе яны былі расстрэляны восенню 1942 г. ў лесе каля в. Лешніца, Маларыцкага раёна. У 1979 г. на магіле ахвяр фашызму, дзе пахаваны і члены сям'і Кіжаватава, камсамольцы раёна ўзвялі помнік. На месцы былой казармы пагранічнай заставы ўсталяваны мемарыяльны знак з надпісам: "Тут па-геройску змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў савецкія пагранічнікі пад камандаваннем начальніка заставы лейтэнанта А. М. Кіжаватава". Яго імем названы вуліцы ў Брэсце, Мінску, пагранзастава, цеплаход Дунайскага



Репозиторий ГрГМУ

параходства, былое сяло Селікса. У 1965 г. А. Я. Патапаў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, а А. М. Кіжаватаву пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Да 9 гадзін раніцы крэпасць была акружана. На працягу дня немцы былі змушаныя ўвесці ў бой рэзерв 45-й пяхотнай дывізіі і 133 пяхотны полк, першапачаткова які з'яўляўся рэзервам корпуса. Ва ўсходняй частцы цытадэлі абаронцам крэпасці ўдалося выбіць немцаў і аб'яднаць баявую групу, якую ўзначальваў лейтэнант А. А. Віняградаў і капітан І. М. Зубачоў, баявую групу палкавога камісара Я. М. Фаміна і старэйшага лейтэнанта Н. Ф. Шчарбакова. А. А. Вінаградаў у выніку беспаспяховай спробы прарыву паранены патрапіў у палон. Прайшоў мноства нямецкіх лагераў. Ён быў вызвалены амерыканскімі вайскамі. А. А. Вінаградаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і ордэнам Чырвонага Сцяга. І. М. Зубачоў 30 чэрвеня цяжка паранены і кантужаны быў захоплены ў палон на разваліінах штабнога казэмата. Загінуў 27 ліпеня 1944 г. ў лазарэце лагера для ваеннапалонных Нюрнберг-Лангвасер. У г. Брэсце яго імем названа вуліца. У 1957 г. Зубачоў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны I ступені. Я. М. Фамін цяжка паранены і кантужаны 26 чэрвеня 1941 г. трапіў у палон у казармах 33-га асобнага інжынернага палка. Быў расстрэляны гітлераўцамі 30 чэрвеня каля Холмскай брамы крэпасці. 3 студзеня 1957 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна. А. А. Шчарбакоў падчас аднаго з фашысцкіх націскаў быў двойчы паранены і кантужаны, 27 чэрвеня яго параненае цела падабралі гітлераўцы і адправілі ў шпіталь г. Брэста, пасля чаго – фашысцкія лагеры смерці. Двойчы бег. Пасля вяртання на Радзіму працягваў служыць камандзірам узвода да сакавіка 1946 г.

Да вечара 24 чэрвеня немцы авалодалі большай часткай крэпасці, за выключэннем участка кальцавой казармы каля Брэсцкай брамы цытадэлі, казематаў у земляным вале і размешчанага на Кобрынскім умацаванні "Усходняга форта" – яго абаронай камандаваў маёр П. М. Гаўрылаў. Пётр Міхайлавіч Гаўрылаў увечары 29 чэрвеня 1941 г. пасля бамбардзіроўкі Усходняга форта з рэшткамі сваёй групы (12 чал. з чатырма кулямётамі) хаваецца ў казематах. Некалькі дзён гурт рабіў вылазкі, пакуль не быў рассеяны. Застаўшыся адзін, 23 ліпеня П. М. Гаўрылаў цяжка параненым трапляе ў палон. Па апісанні доктара Варановіча, які лячыў яго, "…Пленны маёр быў у камандзірскай форме, але ўсё адзенне яго ператварылася ў лахманы, твар быў пакрыты парахавой куравой і аброс барадой. Гэта быў у поўным сэнсе слова шкілет, абцягнуты скурай. Да якой ступені дайшло знясіленне, што палонны не мог нават

зрабіць глытальнага руху. Урачам прыйшлося прымяніць штучнае харчаванне, каб выратаваць яму жыццё. Але нямецкія салдаты распавялі, што гэты чалавек усяго гадзіну таму назад у адзіночку прыняў з імі бой, кідаў гранаты, страляў з пісталета і забіў і параніў некалькіх гітлераўцаў". Ён быў вызвалены савецкімі вайскамі ў маі 1945 г. У 1957 г. Пятру Міхайлавічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля "Залатая Зорка". Таксама ў г. Брэсце яго імем названа вуліца.

Супраціўленне адзіночных савецкіх вайскоўцаў у крэпасці працягвалася да жніўня 1941 г., перад наведваннем крэпасці А. Гітлерам і Б. Мусаліні. Сумарныя страты немцаў у Брэсцкай крэпасці склалі 1197 чалавек за першы тыдзень вайны. Вядома, што камень, які А. Гітлер узяў з развалін маста крэпасці, быў знойдзены ў яго кабінеце ўжо пасля вайны. Для ўхілення апошніх ачагоў супраціву германскае камандаванне аддало загад затапіць скляпы крэпасці вадой ракі Заходні Буг. І нават калі крэпасць была ўжо ўзятая, акружаныя байцы і мясцовае насельніцтва фармавалі партызанскія атрады і барацьба працягвалася.

**Высновы.** Брэсцкая крэпасць стала сімвалам бясстрашнасці і самаахвярнасці савецкіх воінаў. Гэты подзвіг не прайшоў дарма – ён натхніў мільёны людзей на барацьбу з фашызмам і садзейнічаў канчатковай перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне. Брэсцкая крэпасць – гэта памяць аб самых страшных днях у гісторыі савецкага народа. Гэта месца нагадвае нам аб тым, што сілай духу і адзінствам мы можам пераадольваць любыя цяжкасці і перамагаць у самых складаных часах.

**Літаратура**

1. Новікаў, С. Я. Абарона Брэсцкай крэпасці летам 1941 года / С. Я. Новікаў // Беларуская думка. – 2005. – № 5. – С. 88-97.

## О КНИГЕ «ГЕНОЦИД БЕЛОРУССКОГО НАРОДА. ЛАГЕРЯ СМЕРТИ»

**Бекиш А. Г.**

Гродненский государственный медицинский университет
г. Гродно, Беларусь

**Научный руководитель – Гутько А. Г.**

**Введение.** Книга «Геноцид белорусского народа. Лагеря смерти» – дань памяти погибшим, сохранение исторической правды, неопровержимые факты о миллионах загубленных фашистами мирных жизней,



Репозиторий ГрГМУ